# Даследуючы кнігу

**XVIII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні адбудуцца 28—29 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

Праграма канферэнцыі ўключае даклады даследчыкаў і навукоўцаў па самых актуальных тэмах: 100-гадовая гісторыя фарміравання фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, 500-годдзе выдання першай кнігі на гістарычных беларускіх землях, рукапісная кніжнасць Беларусі, калекцыя кніжных помнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, сучасная беларуская кніга і інш.

Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні — адна з галоўных пляцовак краіны для абмеркавання вынікаў навуковых даследаванняў па пытаннях кніжнай культуры і кніжнай спадчыны. Канферэнцыя дасягнула высокага ўзроўню, набыла вялікую папулярнасць і збірае даследчыкаў кнігі з розных краін. Усіх яе ўдзельнікаў аб'ядноўвае нязменная цікавасць да кніжнай культуры Беларусі, яе гісторыі, дасягненняў і перспектыў.

Будзе весціся анлайн-трансляцыя чытанняў.